


# ЛЮБОЎ ДА ЛЮДЗЕЙ І РАДЗІМЫ

**«Васількі на світанні» – так назвала сваю новую кнігу, зборнік беларускай лірыкі наша калега па Саюзе пісьменнікаў Беларусі, паэтэса Тамара Мазур (Гродзенскі раён).**

Кніга Тамары Мазур «Васількі на світанні» невыпадкова мае такую назву. Васілёк – сціплая, але вельмі прыгожая кветка, як краіна Беларусь і яе жыхары, любоў да якіх адлюстроўваецца ў многіх творах паэткі.

У першай частцы лірычнага зборніка змешчана ўдасканаленая і дапоўненая версія знакавай паэмы Т. Мазур «Спадчынная зямля». Наступныя часткі адрасуюцца чытачам, якія захапляюцца кароткімі літаратурнымі формамі. У адной і дзвюх строфах паэтка па-майстэрску перадае канцэнтрацыю думак з глыбокім філасофскім зместам. Далей чытача чакае знаёмства з духоўным асэнсаваннем лірычнай гераіняй розных жыццёвых абставін. Завяршаецца кніга песеннымі тэкстамі з нотамі.

Выданне аздоблена цытатамі з твораў сусветна вядомага беларускага класіка Максіма Багдановіча.

***Анатацыя***

***

Змест новага зборніка лірыкі Тамары Мазур «Васількі на світанні» складаецца з шасці канцэптуальных частак: «Спадчынная зямля», паэма; «Вір жаданяў» (Па адной страфе); «Згустак энергіі» (Па дзве страфы); «Цёплы лівень» (Па тры страфы); «У патоку свядомасці» і «Мелодыя майго радка» (Песні). У аўтарскім рэдагаванні.



***Для даведкі***

**МАЗУР Тамара Міхайлаўна** – паэт, публіцыст, член Саюза пісьменнікаў Беларусі. Па адукацыі – журналіст, выкладчык. Закончыла факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1998) і ІПК і ПК Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы (2024). Маці дваіх дзяцей. Працоўнае жыццё прысвяціла журналістыцы: была карэспандэнтам, рэдактарам аддзелаў рэгіянальных і рэспубліканскіх газет у г. Мінску, на Міншчыне і Гродзеншчыне. Аўтар выдадзеных кніг паэзіі і публіцыстыкі: «Спакуса траўня» (Мінск, «Полымя», 1995); «Ваўкавыск – радзімка Беларусі» (Мінск, «Беллітфонд», 2005); «Пакуль кахаю» (Мінск, «Чатыры чвэрці», 2013); «Скидляне. Скидельцы. Скидельчане» (Гродна, «ЮрСаПрынт», 2021); «Як мае быць…» (Гродна, «ЮрСаПрынт», 2021); «На лініі жыцця. Аповесць пра Уладзіміра Лебедзева» (Гродна, «ЮрСаПрынт», 2023); «Алфавітныя прыпынкі дзяўчынкі Літарынкі» (Мінск, «Ковчег», 2024); «Стихия стихотворения» (Мінск, «Ковчег», 2024). Тамара Мазур – лаўрэат прэміі імя Аляксандра Дубко «За творчыя дасягненні ў галіне культуры і мастацтва» (Гродна, 2013), пераможца Абласнога літаратурнага конкурсу імя Максіма Багдановіча (Гродна, 2024).

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**Гродзенскае абласное аддзяленне**

Яшчэ пра аўтара